НОВОСТИ TUT.BY

**Опубликовано 11 ноября 2015 в 19:05**
Адрес в интернете: http://news.tut.by/culture/472347.html

# Віцебскія лялечнікі адзначаць юбілей Караткевіча тэматычнай выставай і спектаклямі

**Беларускі тэатр «Лялька» ў Віцебску першым у горадзе адзначыць 85-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. Сёння тут адкрылася тэматычная выстава і пройдзе спектакль па творы пісьменніка.**



Помнік Уладзіміру Караткевічу ў Віцебску. Фота: Таццяна Мацвеева

Гледачы ўбачаць спектакль-фантазію «Скрыпка дрыгвы й верасовых пустэчаў». Яна пераносіць у Сярэднявечча, калі па Беларусі падарожнічалі вольныя музыкі. Лепшы з песняроў нагадваў людзям пра адданасць Радзіме. Па матывах твораў Караткевіча ў «Ляльцы» пастаўлены яшчэ два спектаклі: «Забыты скарб» і «Ладдзя роспачы».

Перад пачаткам спектакля адбудзецца вернісаж. У экспазіцыю ўвайшлі працы Міхаіла Ляўковіча, Уладзіміра Вальнова, Вікенція Ральцэвіча, Святланы Баранкоўскай, Вячаслава Шайнурава і іншых мастакоў.

Адзін з твораў на выставе досыць смелы. Гэта выява прыўкраснай напаўаголенай ваяркі

з мячом на фоне гор і вялікага партрэта Караткевіча. Аўтар карціны — Вячаслаў Шайнураў.



Фота: уласны архіў Вячаслава Шайнурава

Выстава будзе працаваць у фае «Лялькі» да 27 лістапада. А 26 лістапада, у дзень нараджэння Уладзіміра Караткевіча, у тэатры пакажуць спектакль «Ладдзя роспачы».

TUT.BY

---

Распечатано с белорусского портала TUT.BY